Міхась ДАНІЛЕНКА

# Герань

Акно з палаты, у якой ляжала цётка Паша (яе клікалі тут Праскоўяй Пятроўнай), выглядвала на паляну. Пасярод яе сіратліва расла старая сасна. Казалі, што раней тут, як і на тэрыторыі, дзе знаходзілася бальніца, раскашаваў лес. Але шматлікія дрэвы некалькі гадоў таму пасохлі, і іх папросту зрэзалі.

Цётка Паша часта, трымаючыся за спінку ложка, паціху тэпала да акна. Садзілася на табурэт і самотна глядзела на адзінокае дрэва. Жанчына чакала, калі да яе зноў наведаюцца Аліна з унучкай Марынкай. Раней, калі Праскоўя Пятроўна летавала ў вёсцы, яны да яе заўсёды прыязджалі. Малая насілася босай па дварышчы, часцяком гойсала па лузе каля Сожа. У дачкі не заладзілася жыццё з мужам (прыкладваўся да бутэлькі), і Аліна аднойчы проста выгнала яго з дому. Цяпер так і жыла адзінокай з маці і Марынкай.

А хату, у якой жыла цётка Паша (ды лічы і ўсё невялічкае паселішча), зраўнялі з зямлёю. На тым месцы, дзе яна жыла колькі гадоў, проста засяваюць участак. Адно, што прывезла з сабою старая да дачкі, калі перабіралася ў горад, — вазон герані. Ён заўсёды цвіў і радаваў Праскоўю Пятроўну кветачкамі, што, як агеньчыкі, гарэлі з вясны да позняй восені.

Сёння баба Паша заварушылася яшчэ прыцемкам. Суседка па палаце, відаць, гэтым незадаволеная, нешта прабурчэла і нацягнула на сябе коўдру.

— Спі сабе спакойна, даражэнькая, — супакоіла яе бабуля. — Я ціхенька пасяджу каля акна ды палюбуюся на сваю сяброўку.

Сяброўкай яна называла сасну. Аднойчы бачыла, як на дрэва прылятаў пярэсты дзяцел. Ён дэталёва абследаваў тоўсты шурпаты ствол дрэва і нешта дзяўбаў у яго густых зялёных шатах.

Дні ў бальніцы цягнуліся доўга і самотна. Сэрца, якое лячыла Праскоўя Пятроўна, быццам ужо і білася больш-менш спакойна. Боль, які раней не адпускаў падоўгу, сцішыўся. Жанчына верыла: неўзабаве яе выпішуць, і зноў яна будзе жыць са сваімі Алінай і Марынкай.

У другой палове дня да бабы Пашы прыехалі ўрэшце жаданыя. Праскоўі Пятроўне падалося, што за той час, як яна ляжала ў бальніцы, Марынка прыкметна падрасла. Вунь прыхавала нешта ў кошыку, які асцярожна прыставіла каля дзвярэй палаты.

— Угадай, бабуля, што мы табе прывезлі? — абдымаючы Праскоўю Пятроўну, прашчабятала дзяўчынка.

— Дзе ж мне, мая красачка, адгадаць. Старая галава ў мяне. Можа, які пірог? Дык нас жа тут нядрэнна кормяць.

— Вось і не адгадаеш, — прыціскаючыся да маршчыністай бабулінай шчакі, радавалася ўнучка. — Гэта вазон. Твая герань.

Аліна распакавала кошык. Сапраўды, у прыгожым пластмасавым вядзерцы красавалася герань. І цвіла! Дробнымі кветачкамі былі ўсыпаны ўсе галінкі.

— Расла яна ў гліняным гаршчочку, — тлумачыла Аліна. — Дык не павязем жа мы яе ў ім — посуд разаб’ецца. Вось прыдбалі на кірмашы

вядзерца. А прыдатнай зямлі твая ўнучка знайшла. Яна хацела нават са мною ў вёску па грунт з’ездзіць. Ды я адгаварыла.

— А мае ж вы даражэнькія, — замітусілася Праскоўя Пятроўна. — Давайце паставім вазон на акно. Тут заўсёды сонейка свеціць...

Дзіўна, але нават негаваркая суседка паднялася з ложка і пачала здзіўлена, быццам ніколі не бачыла, разглядаць герань. Нават пагладзіла лісточкі.

— Няхай расце на здароўе, — нібы каму жывому пажадала баба Паша. — Як выпішуць мяне, дык дзякуй Богу, другому чалавеку можа радасць прынясе. — Праўда? — падняла вочы Марынка. — А як жа. Чалавечая дабрыня заўсёды перадаецца. Трэба толькі рабіць усё ад чыстай душы.

...Так і пасялілася герань у восьмай палаце бальніцы. Многія (і ўрачы з медсястрычкамі) ужо і не помняць, хто паставіў на акно вазон з кветачкамі, якія цвілі і вясной, і летам, і восенню.

І будуць цвісці і зімою, калі паляну вакол адзінокай сасны прыцярушыць снег і на зямлю апусцяцца першыя нясмелыя замаразкі.